Цярэнцьеў Ф.

# КАМАНДЗІР ШТУРМАВОЙ ГРУПЫ

Герой Савецкага Саюза (21.7. 1944) Лаўрэнцій Васілевіч Дземянкоў нарадзіўся 15.7.1918 г. у в. Сакалоўка Чэрыкаўскага раёна. З сялян. Закончыў
1-е Омскае ваенна-пяхотнае вучылішча (1941), Усесаюзны завочны фінансава- эканамічны інстытут (1959). У Чырвонай Арміі з 1938 г. З сакавіка 1942 г. на Ленінградскім і Карэльскім франтах. Праславіўся пры фарсіраванні р. Свір і прарыве абароны ворага ў раёне г. Лабейнае Поле Ленінградскай вобласці. Стралковы ўзвод пад камандаваннем лейтэнанта Л. В. Дземянкова гранатамі знішчыў два дзоты, чым садзейнічаў паспяховаму наступленню нашых часцей. 23.6.1944 г. тройчы штурмаваў варожыя траншэі. Быў паранены, але не пакінуў поля бітвы. Пасля вайны працаваў у органах МУС і КДБ, палкоўнік запасу.

Сорак другі год. Карэльскі фронт. Кругом адзін снег. Ён акутаў і без таго непраходныя лясы і балоты, заваліў вёскі, замёў дарогі, надаўбні, равы, калючы дрот. І дзесьці тут пралягла мяжа, што раздзяліла два полюсы, два міры.

28 снежня лейтэнанта Лаўрэнція Дземянкова і двух яго таварышаў выклікалі ў штаб дывізіі. Патрэбна было захапіць "языка". І не простага. Калі неабходна – весці разведку боем. Раён дзеяння – вышыня, што ў пяці кіламетрах ад лініі фронту.

Каля паўночы тры групы разведчыкаў, адну з якіх узначальваў Лаўрэнцій Дземянкоў, з розных бакоў накіраваліся ўбок праціўніка. Нашы стралялі, свяцілі ракетамі – адцягвалі ўвагу ворага.

Разведчыкі асцярожна рэзалі дрот, намацвалі і абясшкоджвалі міны. Іх было многа. "Як бульбы на полі", – падумалася Дземянкову.

На досвітку ўваткнуліся ў абарону белафінаў, знялі часавых, "закрылі" дзве зямлянкі, захапілі процітанкавую гармату і з яе ж знішчылі дзот, які вельмі перашкаджаў рухацца ўперад на правым флангу. Але тут "языка" не ўзялі.

Дземянкоў загадаў сваёй групе ісці далей. Праскочылі яшчэ метраў трыста ўглыб варожай абароны і акапаліся. Па рацыі Дземянкоў паведаміў абстаноўку намесніку камандзіра палка. Але атрымаць далейшых указанняў не паспеў: завухкалі мінамёты, узнялася кругом зямля. Рацыя выйшла са строю. Разведчыкі апынуліся ў акружэнні.

Дземянкоў паслаў аднаго сувязнога, затым другога. Але яны загінулі ад выстралаў "кукушак" – снайпераў, што хаваліся сярод развесістых елак. Засталося адно – умоўлены сігнал ракетамі: "Дайце агонь на мяне". І зноў няўдача: снарады кладуцца далёка ўбаку, нават

не кранаюць фашысцкіх мінамётаў. Тады лейтэнант падае знак – адыходзіць да першай лініі варожай абароны і трымацца там да загаду.

Белафіны не шкадавалі мін і куль. Яны былі ўпэўнены, што рускія трапілі ў трывалую пастку. Некалькі разоў на працягу дня падымаліся яны ў атаку, але кожны раз акружаныя разведчыкі адбіваліся. А міны кладліся ўсё гусцей. Усё гарачэй станавілася тут, на маленькім кавалку зямлі.

Дземянкоў кінуў гранату ў групу белафінаў, якія беглі насустрач, і ўпаў, аглушаны рэзкім штуршком у лоб. На шчасце, куля фінскага снайпера трапіла прама ў каску каля зорачкі, але не закранула галаву.

Нехта трывожна закрычаў:

– Камандзіра забілі!

Дземянкоў умомант ускочыў на ногі:

– Я жывы. Усім заставацца на месцах, сачыць за праціўнікам.

Да яго падбег камандзір другой групы малодшы лейтэнант Дзятчанка:

– Што рабіць? Загаду адыходзіць няма, а патроны скончыліся... Злоснае шыпенне міны перарвала яго словы.

Ачуняў Дземянкоў за брустверам. Планшэта няма. Кажух на спіне парваны на шматкі. Шавяльнуўся – тупым болем аддало ў паясніцы. "Асколкам, пэўна", – пранеслася ў думках. Рот як бы соллю набіты. Сплюнуў – кроў. Побач Дзятчанка, забіты напавал.

Лаўрэнцій Васілевіч прыўзняўся: фіны, кідаючы гранаты, скакалі ў акопы, лезлі ўрукапашную. Дземянкоў даў чаргу з аўтамата. Упалі. Агледзеўся – уперадзе лагчына. Там можна ўмацавацца. Падцягваючыся на руках, ён папоўз. Адстрэльваўся, пакуль не скончыліся патроны. Чуваць было, што бой перамясціўся ўбок нашай абароны і паступова затухаў. "Значыць, вырваліся, – з палёгкай уздыхнуў лейтэнант. – Значыць, трэцяя група паспела даставіць "языка"...

Апускалася ноч. Буйнымі камякамі паваліў снег. Дземянкоў прыладзіўся ў ямцы пад вершалінай разбітай елкі.

Ён чуў, як усю ноч па полю хадзілі, шукалі параненых, дабівалі іх нажамі. Забітых раздзявалі, а затым ставілі каля дротавай загароджы.

Дземянкоў сціснуў зубы ў бяссільнай злосці. Аўтамат з пустым дыскам дапамагчы не мог. Спіна здранцвела. Слабасць разлілася па ўсім целе. Стукала ў візках. Часам наступала забыццё.

Зімовы дзень згасае хутка. Наступіла другая ноч. Без ежы, без сну, у заваленай снегам яме. У дадатак да ўсяго – падмарозіла. Пад раніцу зусім побач, кроках у пяці, зноў зашамацеў снег. Нехта глуха вылаяўся. Нашы!

Дземянкоў застагнаў...

Яго знайшлі, пацягнулі. На пагорку іх асвяціла ракета. Хвастанулі з усіх бакоў кулямётныя чэргі. Двое так і не ўсталі болей. Параніла і таго байца, што нёс Дземянкова.

У шпіталі Лаўрэнцій Васілевіч сустрэўся са сваім выратавальнікам і ад хвалявання доўга нічога не мог сказаць, а толькі трос і трос яго абедзве рукі.

Месяц правёў Дземянкоў у шпіталі. Тут і спазнаў страшную вестку. Аказалася, што ў часці яго ўжо занеслі ў спіскі без вестак прапаўшых і паведамілі аб гэтым родным. Лаўрэнцій Васілевіч паспяшаўся напісаць матцы, але... яе ўжо не было ў жывых. Яна не перанесла весткі аб гібелі старэйшага сына... Цяжкім каменем лягло гэтае гора на душу лейтэнанта Дземянкова. Ён зноў і зноў хадзіў на самыя рызыкоўныя заданні, браў "языка" там, дзе гэта было амаль немагчыма.Ордэн Чырвонай Зоркі – лепшае сведчанне таму.

20 чэрвеня 1944 г. Дземянкова вызвалі да камандзіра дывізіі. У назначаны час тут сабралася многа ўзводных, якіх Лаўрэнцій Васілевіч добра ведаў. Усе чакалі чагосьці значнага.

Генерал быў немнагаслоўным:

– Перад вамі ставіцца адказная задача. Па загаду Вярхоўнага Галоўнакамандуючага мы пераходзім у рашучае наступленне па ўсім фронце. Наступіў час канчатковага вызвалення нашай зямлі ад фашысцкай нечысці. Вы назначаецеся камандзірамі атрадаў прарыву, будзеце кіраваць штурмавымі групамі, за якімі пойдуць галоўныя сілы.

Тры гады стаяў тут вораг, усё аблытаў калючым дротам, набудаваў магутных дотаў і дзотаў, у некалькі радоў замініраваў увесь бераг. А сёння нашы часці падышлі ўшчыльную да гэтых цвярдынь і сталі на зыходныя пазіцыі каля горада Ладзейнае Поле, паміж Анежскім і Ладажскім азёрамі, побач з рэчкай Свір. Заўтра – бой.

...Вечарам да Дземянкова сталі адзін за другім падыходзіць афіцэры:

– Кулямётчыкі прыбылі ў ваша распараджэнне...

– Сапёры...

– Мінамётны ўзвод...

– Разлік процітанкавых ружжаў...

Шматлікія прадстаўнікі рознага роду зброі склалі адзін ударны кулак – перадавую групу прарыву варожай абароны. Дзесьці там, за гушчаром дрэў, чакалі ўмоўнага сігналу іншыя такія ж штурмавыя атрады. Лаўрэнцій Васілевіч уважліва ўглядаўся ў процілеглы бераг шырокай і бурнай ракі. Здавалася, што там, акрамя дзікіх няходжаных лясоў і балот, нічога няма. Але лейтэнант ведаў: адразу каля абрыву – першая лінія абароны праціўніка. Яе трэба прарваць з ходу, пасля пераправы, затым уклініцца ўглыб прыкладна на кіламетр, захапіць тракт і не даваць гітлераўцам падцягваць сілы да месца прарыву. Цішыня раптам раскалолася, зямля вухнула, загудзела. На тым беразе замільгалі ўсполахі ўзрываў у гразна-дымным тумане. Ажыў лес. Дзесяткі лодак кінуліся ўперад. У кожнай – па пятнаццаць-дваццаць салдат. Грабуць хто вяслом, а хто – дошкай, жэрдкай. Хутчэй, хутчэй. Але вораг паспеў апамятацца. Паласнулі па вадзе доўгія і кароткія чэргі, рака ўспенілася, ад бартоў лодак паляцелі шчэпкі. Калі да берага

заставалася якіх-небудзь дваццаць метраў, побач з лодкай Дземянкова ўзмятнуўся слуп вады. Лодку падкінула і перавярнула. Кулямёт вокамгненна пайшоў на дно. Цяжкія боты і сумка с боепрыпасамі цягнулі ўніз. Сілы пакідалі салдат. І раптам крык Дземянкова:

– Станавіся ўсе! Тут мелка!

Першая лінія абароны была зламана адразу. Рэшткі ворага беглі ў паніцы ўверх па траншэях. Праціўнік не вытрымаў імклівага націску штурмавой групы і паспешна стаў адступаць. Спроба байцоў на плячах ворага ўварвацца ў акопы гэтага рубяжа поспеху не мела. Штурмавая група наткнулася на міннае поле, ззаду якога была дротавая, загароджа ў тры рады. А на вышыні знаходзіўся дзот, агонь з якога не даваў магчымасці байцам лейтэнанта ісці ўперад – з пярэдняй амбразуры біла 75-міліметровая гармата, з бакавых – кулямёты.

Лейтэнант Дземянкоў разумеў, што ўперад не пройдзеш, пакуль не будзе знішчаны дзот. Баявое заданне, якое выконвала яго група ва ўзаемадзеянні са штурмавой групай лейтэнанта М. П. Бераставенкі, было пад пагрозай зрыву. Варожы дзот трэба ўціхамірыць. Камандзір узвода паслаў добраахвотнікаў і сапёраў. Ім удалося падабрацца да варожай агнявой кропкі і закідаць яе гранатамі. Прагучала адначасова некалькі выбухаў, і дзот замаўчаў.

Тады лейтэнант Дземянкоў падняўся ва ўвесь рост і крыкнуў:

– За Радзіму! Уперад!

За ім рынуліся салдаты, праклалі сабе шлях праз завал, пераадолелі па праходу міннае поле і выбілі праціўніка з акопаў. Праз некалькі хвілін штурмавая група выйшла на дарогу Сартавала – Петразаводск. Мэта, якая стаяла перад яго ўзводам, была дасягнута, і цяпер лейтэнант павінен замацаваць за сабой заваяваны рубеж.

Заняць абарону ўздоўж шашы, – загадаў ён. – Падрыхтавацца да контратакі праціўніка. Не прайшло і паўгадзіны, як штурмавы атрад быў гатовы да бою. Байцы схаваліся ў варонках ад мін і снарадаў, укрыліся за валунамі, выкапалі сабе стралковыя ячэйкі. Лейтэнант выставіў на больш небяспечныя ўчасткі кулямёты, а на танканебяспечныя – бранябойшчыкаў, некалькі чалавек назірала за ворагам. У хуткім часе яны паведамілі, што вораг пачынае атаку. Але Дземянкоў заўважыў гэта раней, чым назіральнікі, і даўно загадаў падрыхтавацца да бою. Каля батальёна варожай пяхоты рушыла на пазіцыі штурмавога атрада лейтэнанта Дземянкова. Але ён не спяшаўся аддаваць загад, чакаў, калі вораг падыдзе бліжэй. Затым скамандаваў:

– Агонь!

Ударыў дружны залп. Многа фашыстаў засталося ляжаць на зямлі, але астатнія працягвалі ісці ўперад. Варожыя шарэнгі радзелі, і наступіла хвіліна, калі фашысты спыніліся, а затым кінуліся наўцёкі. Ім наўздагон ударыў яшчэ адзін дружны залп.

– Спыніць агонь, берагчы патроны! – перадаў па ланцугу Дземянкоў загад, і над пазіцыяй узвода павісла цішыня.

Цягнулася яна нядоўга. Вораг зноў пайшоў у контратаку і зноў быў спынены і адкінуты на зыходны рубеж. Але ў хуткім часе праціўнік пачаў атакі з усіх бакоў. Ворагу ўдалося адрэзаць атрад Дземянкова ад асноўных сіл.

...Ішла сёмая гадзіна бою, калі на дапамогу Дземянкову прыйшоў узмоцнены ўзвод лейтэнанта М. Бераставенкі. Яго салдаты прайшлі той жа шлях, што і байцы Дземянкова, але з правага фланга. Два ўзводы вялі бой у акружэнні да таго часу, пакуль на выручку ім не прыйшлі дэсантнікі, скінутыя ў тыл ворага каля 22 гадзін вечара. Яны ўдарылі па фашыстах з тылу, а з фронту на штурм пайшлі асноўныя сілы палка. Вораг не вытрымаў двайнога ўдару і стаў паспешна адступаць. Абарона праціўніка была прарвана, і ў прарыў кінулася ўся 272-я стралковая дывізія.

Раніцай лейтэнанту Дземянкову, які працягваў ісці ўперадзе палка, загадалі прыняць камандаванне стралковай ротай. Рота лейтэнанта вызваліла гарады Алянец, Відліцу, Сальмы, Піткяранту. Пры штурме апошняга Дземянкоў быў цяжка паранены. 6 ліпеня 1944 г. рота Дземянкова падышла да вышыні перад Піткярантай. Тут і завязаўся цяжкі бой. Вышыня некалькі разоў пераходзіла з рук у рукі. Калі рота ў апошні раз авалодала гэтым пунктам, у яе складзе заставалася ўсяго 17 чалавек. На вяршыні адзін з параненых салдат праціўніка выпусціў па Дземянкову чаргу з аўтамата.

Пасля шпіталю Дземянкова адправілі на лячэнне ў глыбокі тыл. Там і даведаўся Лаўрэнцій Васілевіч, што яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

**Цярэнцьеў, Ф. Камандзір штурмавой групы / Ф. Цярэнцьеў // Памяць : Чэрыкаўскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдакцыйная калегія: В. М. Ермакоў [і інш.]. — Мінск, 1994. — С. 462—465.**